УДК 392.5

**В.І. МІШЫНА**

# ПРАСТОРАВА-ЧАСАВЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ТРАДЫЦЫЙНАГА КАРАВАЙНАГА РЫТУАЛУ БЕЛАРУСАЎ XIX – пачатку XX стст.

*Артыкул прысвечаны прасторава-часавым аспектам функцыянавання каравайнага рытуалу ў складзе комплексу традыцыйнага беларускага вяселля. Аўтарам разгледжаны асноўныя спробы вытлумачэння сімволікі каравайнага рытуалу такімі даследчыкамі, як М.Ф. Сумцоў, М.В. Доўнар-Запольскі, М.М. Нікольскі, А.К. Байбурын, Вяч.Ус. Іваноў, У.В. Тапароў.*

*На базе шырокага кола этнаграфічных і фальклорных крыніц XIX – першай пал. XX стст. (апісанні вясельных абрадаў, песенныя ўзоры, іншыя фальклорныя формы) у артыкуле прааналізаваны галоўныя этапы рытуалу ў іх суаднесенасці ў прасторы і часе. Ажыццёўлена спроба вызначэння асноўных локусаў рытуалу і характарыстыкі іх семіятычнага статусу. Таксама разгледжаны функцыі асноўных персанажаў і матэрыяльных атрыбутаў рытуалу, характарыстыкі яго акцыянальнага і вербальнага кампанентаў, вызначаны асноўныя аспекты сімволікі рытуалу.*

## Уводзіны

Рытуалу выпякання каравая належыць адно з цэнтральных месцаў у традыцыйным абрадавым комплексе беларускага вяселля. У большасці лакальных традыцый менавіта каравай служыць пачаткам уласна вяселля (за выключэннем нешматлікіх зафіксаваных выпадкаў, калі выпяканне каравая адбываецца ў іншы час). Сам каравай зяўляецца цэнтральным атрыбутам вяселля і суправаджае практычна кожны з яго этапаў.

Безумоўна, значнасць і развітасць каравайнага рытуалу не маглі не выклікаць да яго цікавасць з боку даследчыкаў традыцыйнай культуры яшчэ ў XIX ст. Так, М.Ф. Сумцоў, аналізуючы сімволіку каравая ў сваіх працах ("Аб вясельных абрадах, пераважна рускіх", "Хлеб у абрадах і песнях" [1]), прыходзіць да высновы, што каравай з'яўляўся прадметам ахвярапрынашэння боствам і духам, а таксама сімвалізаваў нябесныя свяціла, адначасова з'яўляючыся сімвалам маладых і ўвасабленнем хатняга дабрабыту. Як адзначае даследчык, "ва ўрачыстым абрадавым караваі заслугоўвае ўвагі яго выраб і ўжыванне, што ў найбольш архаічных вяселлях адно ад другога аддзяляецца, прычым гатаванне суправад-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

жаецца аднымі абрадамі і песнямі, а ўжыванне – другімі своеасаблівымі абрадамі і песнямі" [1, с. 196].

М.В. Доўнар-Запольскі ў працы "Рытуальнае значэнне каравайнага абраду ў беларусаў" [2] таксама адзначаў, што "каравайны абрад, нароўні з абрадам пасаду, можа быць прызнаны цэнтральнай часткай вяселля" [2, с. 147]. Даследчык звяртае ўвагу на такі элемент рытуалу, як заклік да бостваў, просьбу да іх аб прысутнасці падчас выпякання каравая, аб удзеле ў гэтым працэсе, указвае на ролю бостваў у надзяленні маладых доляй, якая ўвасабляецца менавіта ў "багацці хлеба і патомства, даўгалецці шлюбнай пары" [2, с. 148-149]. Таксама Доўнар-Запольскі адзначае яскрава выяўленую эратычна-прадуцыруючую сімволіку рытуалу [2, с. 150-152].

Дэталёвы аналіз каравайнага рытуалу ажыццявіў М.М. Нікольскі ў сваім даследаванні "Паходжанне і гісторыя беларускай вясельнай абраднасці" [3]. Як адзначае навуковец, "увесь працэс гатавання каравая, пачынаючы ад яго замешвання і канчаючы выманнем з печы, з'яўляецца свяшчэннай абрадавай цырымоніяй, якая ажыццяўляецца адпаведна спецыяльнаму традыцыйнаму рытуалу пэўнымі выканальнікамі і суправаджаецца спяваннем спецыяльных песень, спецыяльнымі скокамі і некаторымі іншымі цырымоніямі" [3, с. 181]. Сярод сімвалічных аспектаў, на якія звярнуў увагу М. Нікольскі, – адушаўленне каравая ў абрадавым фальклоры [3, с. 182], увасабленне ў гэтым атрыбуце некалькіх бостваў – бога-продка, бога шлюбу і бога ўраджаю [3, с. 184-193] і, адпаведна, сакральны характар усіх абрадавых дзеянняў, звязаных з выпяканнем каравая [3, с. 196-228].

Далейшае развіццё спробы вытлумачэння сімволікі каравайнага рытуалу атрымалі ў працах Вяч.Ус. Іванова і У.М. Тапарова. Даследчыкі разглядаюць каравай як культурны сімвал, у якім адбыўся пераход ад прыроднага, першаснага прадукту да штучнага, другаснага вырабу культуры [4, с. 64]. Аналізуючы структуру і атрыбутыку каравайнага рытуалу, навукоўцы прыходзяць да высновы аб тым, што каравай з'яўляецца ўвасабленнем сусветнага дрэва, а "ўся паслядоўнасць рытуалаў калектыўнага выпякання каравая амаль усёй вёскай... можа быць супастаўлена з калектыўным узвядзеннем шаманскага сімвалу, які ўзыходзіць да сусветнага дрэва ці ім з'яўляецца... Адпаведна, каравайніца і яе памочнікі і памочніцы (да якіх іншы раз у каравайных песнях далучаюць Бога...) выступаюць у функцыі, аналагічнай ролі старажытных жрыц ці шаманаў" [4, с. 68-69].

А.К. Байбурын адзначыў яшчэ адзін сімвалічны аспект каравая – увасабленне калектыўнай долі, якая пераразмяркоўваецца паміж усімі ўдзельнікамі вясельнага абраду (фактычна – прадстаўнікамі роду) з улікам стварэння новай сям'і [5, с. 82].

Такім чынам, розныя меркаванні даследчыкаў адлюстроўваюць шматзначнасць рытуальнага атрыбута (каравая) і шматузроўневае кадзіраванне тэксту ў ходзе самога каравайнага рытуалу. Аднак, на нашу думку, у названых вышэй працах не атрымаў належнага асвятлення яго прасторава-часавы аспект. Разам з тым прасторавы і часавы коды адлюстроўваюць элементы традыцыйнай карціны свету, складаюць неад'емны кампанент любога рытуальнага дзейства і разам з іншымі кодамі (вербальным, акцыянальным, прадметным), уласна кажучы, і ствараюць суцэльнае "палатно" рытуалу.

Мэта дадзенага артыкула – прааналізаваць прасторава-часавыя характарыстыкі традыцыйнага каравайнага абраду беларусаў на падставе фальклорных і этнаграфічных матэрыялаў XIX – пачатку XX стст.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

**Асноўная частка**

Галоўны сэнс каравайнага абраду – гатаванне абрадавага печыва, сакральнага атрыбута, у якім увасабляюцца ўсе найважнейшыя каштоўнасці, неабходныя для існавання новаўтворанай сям'і. Паводле Т. Валодзінай, "каравай выяўляе ў традыцыйнай культуры беларусаў цэлую гаму семантычных параметраў, сярод якіх дамінуючыя пазіцыі займаюць ідэі багацця і ўраджаю, шлюбу і культу продкаў, ідэі самога роду" [6, с. 45]. Удалы, прыгожы, вялікі каравай сімвалізуе дабрабыт, сямейную згоду, нараджэнне здаровага патомства. Аднак каравай увасабляе не толькі долю маладых, але і долю ўсяго роду, якая нанава пераразмяркоўваецца паміж усімі яго прадстаўнікамі з улікам новай сям'і. Значыць, ад выпякання ўдалага каравая залежыць шчасце не толькі маладых, але і ўсяго роду. Адсюль – вялікае значэнне набывае дакладнасць выканання ўсіх аперацый па гатаванні каравая і, адпаведна, павялічваецца колькасць разнастайных магічна-сімвалічных дзеянняў, што прызваны садзейнічаць дасягненню пастаўленай мэты.

Як паказваюць апісанні XIX – пачатку XX стст., адзінага часу для пачатку гатавання вясельнага абрадавага пірага не існавала, таму лакальныя традыцыі вылучаюцца ў гэтым плане вялікай разнастайнасцю. Даволі шмат указанняў на пачатак выпякання каравая ў суботу, напярэдадні вяселля (раніцай, у сярэдзіне дня ці вечарам). Часта каравай выпякалі і ў нядзелю, прычым, у залежнасці ад мясцовай традыцыі, у розны час дня. У асобных выпадках працэс стварэння каравая мог расцягвацца на некалькі дзён. Так, у надзвычай дэталёвым апісанні вясельнага абраду, зробленым М. Федароўскім, указваецца, што рашчынялі каравай у чацвер перадвясельнага тыдня (чацвер гэты называецца *зачатным* [7, с. 27]), а пяклі – у суботу [7, с. 31]. Паводле аднаго з апісанняў, змешчаных у зборніку П.В. Шэйна, каравай выпякаецца ў той час, калі маладыя знаходзяцца ў каморы [8, с. 216].

Дапушчальна, што ў кожным лакальным варыянце існавала сваё тлумачэнне, чаму менавіта дадзены момант быў абраны для пачатку выпякання каравая, аднак, на жаль, апісанні не ўтрымліваюць такой інфармацыі. Верагодна, акрамя чыста утылітарных меркаванняў, тут прысутнічалі яшчэ і сімвалічныя. У шэрагу выпадкаў менавіта з выпяканнем каравая суадносіцца пачатак уласна вяселля, хаця гэта адзначаецца не заўсёды.

У любым выпадку час ажыццяўлення каравайнага рытуалу (як і любога рытуалу ўвогуле) не супадае паводле сваіх характарыстык з часам будзённым, ён надзяляецца прыкметамі сакральнасці і ў сувязі з гэтым набывае значнасць у плане прадвызначэння будучыні, закладвання пэўных узораў. Таму, паводле народных уяўленняў, падзеі і з'явы, што маюць месца ў час выпякання вясельнага каравая, указваюць на будучае жыццё маладой сям'і, а дзеянні, што выконваюцца ў гэты час, могуць уплываць на будучы лёс маладых як станоўчым, так і адмоўным чынам.

Непасрэдна працэс падрыхтоўкі і выпякання каравая ўяўляе сабой шматгадзіннае дзейства, складзенае з пэўнай паслядоўнасці асобных этапаў і абумоўленае кулінарнай "тэхналогіяй": падрыхтоўка прадуктаў – падрыхтоўка і падыходжанне цеста – фармаванне каравая і аздабленне – саджанне ў печ – выпяканне – даставанне з печы. На гэтую "тэхналагічную канву" накладваюцца асноўныя кампаненты рытуалу: разнастайныя магічныя і сімвалічныя дзеянні, адпаведныя песні, замовы і прыгаворы, харэаграфічныя элементы.

Выпяканне каравая ў вясельным фальклоры набывае выгляд усеагульнага, калектыўнага дзейства, у якім прадстаўнікі розных полаўзроставых груп надзелены дакладна дыферэнцыраванымі функцыямі: *"Сабірайся, род, к роду, //*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*А старыя мужы, на параду, // Маладыя маладзіцы, к караваю, // Красныя дзевачкі, ка саду, // А старыя мужы раду радзіць, // Маладыя маладзіцы каравай мясіць, // Красныя дзевачкі песні пець"* [9, с. 45-46]. Такім чынам, як адзначае М. Нікольскі, у такіх варыянтах песень "мы знаходзім указанні на тры катэгорыі функцый калектыву: па-першае, "для параду" ці "для парадку", г. зн. для нагляду за выкананнем рытуалу, па-другое, "песні пець" і нарэшце ўласна рабіць каравай – "каравай учыняць"..." [3, с. 208].

У рэальнасці каравай учыняўся спецыяльна абранымі "каравайніцамі", колькасць якіх неаднолькавая ў лакальных традыцыях, як і шлюбны статус. Напрыклад, у Барысаўскім павеце браліся за работу "тры або пяць каравайніц" [8, с. 74]; у Мінскім павеце іх было дзявяць [10, с. 109], у Свянцянскім – пяць або шэсць [10, с. 205]; у асобных апісаннях колькасць каравайніц дасягае васьмі – дзесяці [10, с. 494], нават дванаццаці [11, с. 205] ці трынаццаці [11, с. 184]. У адных выпадках гэта абавязкова замужнія жанчыны [10, с. 205], у другіх – дзяўчаты [10, с. 109]; часта сустракаюцца звесткі і аб змешаным характары калектыву каравайніц [7, с. 31; 10, с. 207]. Сярод іх вылучаецца старшая каравайніца як кіраўніца рытуалу і пачынальніца кожнага яго этапу. На гэтую ролю (акрамя тых выпадкаў, калі каравайніцамі бываюць выключна дзяўчаты) запрашаюць хросную маці або старэйшую ў хаце жанчыну, сваячку ці даўнюю прыяцельку сям'і, абавязкова замужнюю: "Глядзелі, каб самая старшая каравайніца была не ўдава, не разлучніца – паказвала прыклад у сямейным жыцці" [10, с. 603]. У пэўнай колькасці апісанняў сустракаюцца звесткі пра ўдзел у каравайным рытуале аднаго ці некалькіх мужчын, як халастых, так і жанатых, якія не толькі выконваюць дапаможныя работы, але і садзяць каравай у печ [8, с. 227; 10, с. 284].

Прыход каравайніц у абрадавым фальклоры абстаўлены як доўгае падарожжа з прыкметамі міфалагічнага шляху: *"Гарою высокаю, // Дарогаю шырокаю // Там ішлі каравайніцы // І пыталіся сяла // Да Таццянкінага двара..."* [9, с. 56]. Яны надзяляюцца надзвычайнымі характарыстыкамі, параўноўваюцца са свяцiламі: *"Каравайнічкі прышлі, // Так як зораньні зышлі, // Каравайніцы красны, //Так як зораньні ясны"* [9, с. 45]. Больш таго, на ролю старшай каравайніцы прэтэндуе сама Прачыстая, якая ідзе "цераз поле сцежачкай, цераз мора кладачкай" [9, с. 57].

Гэта дазваляе гаварыць аб высокім рытуальным статусе каравайніц. Матывы прыходу іх здалёк, пераадольвання на шляху разнастайных перашкод сведчаць аб блізкасці каравайніц да іншасвету, да боскай сферы ці, як мінімум, іх пасрэдніцкай ролі ў кантактах паміж "сваім" і "чужым".

Набор прадуктаў для гатавання каравая мае "зборны" характар, што таксама знайшло адлюстраванне ў абрадавых песнях. Так, паводле аднаго з песенных узораў, каравайніцы прыносяць з сабой "па місцы мукі", "па капе яец", "па пуду масла", "па гарцу аўса" [9, с. 58]. Наздвычайная колькасць прадуктаў указвае на такія ж надзвычайныя памеры каравая, што, у сваю чаргу, характарызуе яго як сакральны атрыбут, які суадносіцца са светам боствау.

Адначасова ў каравайным фальклоры даволі распаўсюджаны матыў збору прадуктаў прадстаўнікамі роду: дзядзькі прыносяць муку, цёткі – масла, браты – соль, сёстры – яйкі [9, с. 47]. Такім чынам, можна гаварыць аб частцы "долі" індывідуальнай, якую кожны ўкладае ў стварэнне сімвала "долі" калектыўнай. Тут таксама звяртае на сябе ўвагу гіпертрафіраваная колькасць прадуктаў: "сем пуд мукі", "сем пуд масла", "сем пуд солі", "семсот яец" [9, с. 47]. Пры гэтым, як падкрэсліваюць Вяч.Ус. Іваноў і У.М. Тапароў, "сімволіка каравайных песень часцей за ўсё зводзіцца да трох і сямі, што ўзгадняецца з адпаведнымі канстантамі ў шаманскіх рытуалах" [12, с. 254].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Матэрыялы апісанняў паказваюць, што розныя прадукты (і неабавязкова толькі тыя, што патрэбны і для каравая) запрошаныя жачыны прыносілі з сабою і ў рэальнасці. Гэта маглі быць сыр, масла, крупы, сала, хлеб, авёс, гарэлка, нават палатно. Відавочна, што колькасная перабольшанасць, "лішкавасць" прадуктаў увасабляюць ідэі множнасці, дабрабыту, спору, якія мусяць быць "закладзенымі" ў каравай, а значыць, і прысутнічаць у далейшым жыцці маладых.

Такім чынам, выпечка ўдалага каравая становіцца неабходнай, можна сказаць, жыццёва важнай мэтай для маладых і для ўсёй грамады. Таму шырока распаўсюджанымі з'яўляюцца ўяўленні кшталту: "Удалым лічыцца каравай, які, калі ён спячэцца, выняць з печы можна, толькі выламаўшы некалькі цаглін з чалесніка. Пра такі каравай кажуць: "*Вакол з сырам, з маслам, а ў сярэдзіне з добрым шчасцем*". Удалы каравай прадракае маладым добрую гаспадарку" [10, с. 110]. Парушэнне цэласнасці каравая падчас выпякання, у сваю чаргу, прадказвае маладым кепскую будучыню: *"Калі каравай расколецца ў час выпякання, то адзін з маладых вельмі хутка "адколецца", г.зн. памрэ"* [13, с. 58].

Відавочна, што для дасягнення пастаўленай мэты неабходна заручыцца падтрымкай і спрыяннем звышнатуральных сіл і адначасова засцерагчыся ад магчымага негатыўнага ўздзеяння. Акрамя таго, паколькі размова ідзе фактычна пра крэацыйны акт, неабходна дакладна прытрымлівацца рытуальнай рэгламентацыі дзеянняў падчас выканання абраду.

Пералічаныя вышэй абставіны абумоўліваюць павышэнне семіятычнага статусу ўнутранай прасторы хаты і розных яе элементаў. Аўтар аднаго з апісанняў, змешчаных у зборніку Шэйна, адзначае, што перад пачаткам выпякання каравая, зранку, дзяўчаты прыбіраюць хату, чысцяць, мыюць сцены, лаўкі, посуд [8, с. 376]. Згадаем, што прыбіранне хаты – абавязковы элемент падрыхтоўкі да найбольш значных святаў гадавога кола, такіх як Дзяды, Каляды, Вялікдзень. Чысціня – адна з галоўных характарыстык хатняй прасторы ў кантэксце рытуалу, катэгорыя "чыстага" збліжаецца з катэгорыяй "новага", што надае знакавы характар усім падзеям, якія будуць у яе межах адбывацца.

У гарызантальным плане асноўныя рытуальныя дзеянні лакалізуюцца на сакральнай восі "печ" – "чырвоны кут", прычым у розныя моманты могуць быць актуалізаваны не толькі яе процілеглыя полюсы, пазначаныя найвышэйшай семіятычнасцю, але і кропкі ўздоўж гэтай восі, семіятычны статус якіх таксама істотна павышаецца. Так, паводле апісанняў, дзяжу для рашчынення цеста ставяць "на сярэдзіне хаты" [7, с. 28], "пасярод падлогі" [10, с. 110], прычым рытуальная прастора насычаецца атрыбутамі з высокім семіятычным статусам: "...ставіцца кошык, напоўнены жытам; ён накрываецца кажухом, а на кажух ставяць дзяжу..." [10, с. 110]; "... каравайніцы бяруць *дзяжу*, у якой замешана цеста для каравая, і ставяць яе пасярод хаты на меншую дзяжу, перавернутую ўверх дном. Пад гэтай апошняй дзяжой ставяць на талерцы чарку гарэлкі і закуску" [10, с. 284]. Наяўнасць атрыбутыкі, якая валодае перш за ўсё сімволікай урадлівасці, ужо на гэтым пачатковым этапе маркіруе агульную мэтавую скіраванасць рытуальных дзеянняў.

Характэрна, што кожны этап у выпечцы каравая пачынаецца зваротам да ўсёй грамады і звышнатуральных сіл з просьбай аб блаславенні, г.зн. надзвычай вялікае значэнне набывае вербальны кампанент. На гэта ўказвалі самі аўтары апісанняў: "Перад кожным дзеяннем у працэсе гатавання каравая, як, напрыклад, перад рашчыненнем, замешваннем і саджаннем яго ў печ, запытваецца блаславенне" [8, с. 240]. Пачатак асобных этапаў можа таксама маркіравацца рытуалізаванымі рухамі ў спалучэнні з акустычнымі і вербальнымі кампанентамі: каравайніцы «...выносяць з клеці дзяжу з рашчыненым цестам. Паставіўшы яе

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

на зямлі пасярод хаты, бяруцца са сватам накрыж за рукі і пры гуках скрыпак тройчы робяць вакол дзяжы круг. Пляскаючы ў далоні, гукаюць і выкрыкваюць: *“Ух-я! Будзем каравай мясіці, вяселле зачынаці, гарэлку прапіваці, белаго сыра кусаці”*» [7, с. 32].

Маніпуляцыі з дзяжой і прадуктамі на працягу ўсяго працэсу падрыхтоўкі цеста носяць падкрэслена знакавы характар: “Муку прасяваюць па чарзе ўсе каравайніцы, усе таксама павінны сыпаць яе ў дзяжу і ліць ваду – рашчыняць” [8, с. 110]; «свацця сыпле муку, бацька лье ваду, а сват пырскае некалькі кропель гарэлкі, кажучы: *“А я, сват, як ваш родны брат, падалью гарэлкі, але не думайце, што яна горка і што я сваім дзецям жычу горкаго. Я ім усяго таго жычу, чаго яны ад Бога сабе жадаюць, – только як я ад гарэлкі сягоння падвесяліўся, то так і хачу, каб і яны весяліліся”*» [7, с. 129]; старшая каравайніца, рашчыняючы ў дзяжы цеста, некалькі разоў перахрышчвае яго рукою [10, с. 370].

Працэс падрыхтоўкі каравайнага цеста суправаджаецца дзеяннямі, якія павінны паўплываць на будучы лёс не толькі маладых, але і іншых прадстаўнікоў роду: “Калі работа падыходзіць да канца, дзяўчаты і хлопцы становяцца ў рады каля дзяжы, і, як толькі старшая каравайніца скажа: “да хвала табе, Божа, што работку зрабілі – каравай рашчынілі” – і возьме дзяжу, каб пераставіць яе на іншае месца, усе кідаюцца да кошыка з жытам. Пачынаецца ўпартая барацьба: хлопцы стараюцца адабраць яго ў дзяўчат, каб закінуць на печ, а тыя не аддаюць, імкнучыся выкінуць яго за парог. Лічыцца, што ў тым выпадку, калі хлопцам удасца іх намер, дзяўчаты ў гэтым годзе не выйдуць замуж, калі ж не – то выйдуць” [10, с. 110]. “Калі ў бацькоў ёсць яшчэ дочкі на выданні, сват пасля таго, як рашчыняць каравай, прыпадымае ўгару дзяжу ў чатырох супрацьлеглых месцах. Гэта таму, каб і яны на месцы не сядзелі” [7, с. 29]. Дакладна рэгламентаваныя дзеянні каравайніц мелі на мэце “праграмаванне” адносін у будучай сям'і: “Каравайнае цеста належыць мясіць не кулаком, інакш муж будзе біць сваю жонку, а далонямі” [13, с. 58]; “у хмурны дзень каравай рашчыняюць у тыя хвіліны, калі сонца выгляне з-за хмары, бо, калі рабіць наадварот, то маладых, паводле павер'я, чакаюць у жыцці сумныя дні, поўныя няшчасцяў і шматлікіх клопатаў” [7, с. 29]. У момант замешвання караваяў у цеста ўтыкалі дзве лыжкі і па іх размяшчэнні пасля таго, як цеста падыдзе, меркавалі, будуць маладыя жыць разам або развядуцца [10, с. 541]. Мэтанакіраванасць дзеянняў знаходзіць адлюстраванне і ў адпаведных фальклорных узорах: *“Гібніце (мясіце) каравай харашэнька, // Каб наш каравай красен быў, // Каб наш Іванка весел быў, // Каб ён весел быў як вясна, // Каб ён багат быў, як зямля, // Каб ён здароў быў, як вада!”* [10, с. 236].

З “праграмаваннем” пладароддзя і кахання ў маладой сям'і звязаны і зафіксаваны ў некаторых апісаннях звычай вылівання вады, у якой памылі рукі каравайніцы, у садзе пад пладовыя дрэвы, што суправаджаўся адпаведным прыпевам: *“Хаця ж ручкі памыці // Да на вішанькі зліці, // Штоб вішанькі развіваліся, // Маладыя цалаваліся”* [10,с. 543]; або: *“Мыйтэ ручкі, коровайночкі, // На вышэнькі літэ, // Шчоб вышэнькі родылыса, // А нашы діты любылыса”* [14, с. 112].

Павышаная сакральнасць прасторы хаты, акцэнтуацыя яе ролі як рытуальнага цэнтра, касмічны характар усяго дзейства робяць магчымай прысутнасць падчас каравайнага рытуалу звышнатуральных сіл. Кожны этап выпякання каравая суправаджаецца зваротам-запрашэннем да Бога: *“Ты саступ, Божа, з неба, // Як нам цяпер трэба! // Памагаў рашчыніць, // Памагай замясіць //... Не стой, Божа, за дзвярмі, // Да ідзі, Божа, ў хату, // Да сядзь, Божа, на куце, // Да дай долю маладзе”* [8, с. 74]. Болей таго, як вынікае з вясельнага фальклору, міфалагічныя персанажы прымаюць у гэтым працэсе самы непасрэдны ўдзел: *“А ў майго дзіцяці // Сам Бог караваю меся, // Прачыстая свеця,// Ангелы ваду носяць...* [9, с. 52].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Аднак празрыстасць межаў паміж светамі робіць больш лёгкім і пранікненне варожых сіл, якія могуць нашкодзіць удзельнікам рытуалу і непасрэдна караваю. Таму неад'емным кампанентам каравайнага рытуалу з'яўляюцца разнастайныя прыёмы апатрапейнай магіі, якія ўвасабляюцца ў акцыянальнай, вербальнай форме або з дапамогай атрыбута-абярэга. Напрыклад, хрышчэнне дзяжы і цеста ў ёй [7, с. 28] або трохразовы абыход вакол дзяжы з запаленай свечкай, якая, "на думку сялян, мае сілу адганяць нячысты дух, таму і захоўваецца ў кожнай сялянскай хаце" [10, с. 370].

Звяртае на сябе ўвагу абсалютызацыя эратычнага пачатку ў каравайным абрадзе. Сакралізацыя прасторы абумоўлівае, побач з іншымі дабротамі, спадзяванне на нараджэнне шматлікага патомства ў маладых, а таксама на пладнасць жывёлы і ўрадлівасць нівы. Уласна кажучы, усё гэта і складае аснову дабрабыту сям'і ў традыцыйнай супольнасці, таму, "закладваючы" ў каравай "долю-шчасце", туды закладваюць перш за ўсё пладнасць ("спор") у самым шырокім сэнсе гэтага паняцця.

У святле семіётыкі прасторы выклікае цікавасць і рытуал саджання падрыхтаванага каравая ў печ. Прысутнасць у ім мужчыны, акцыянальны кампанент тлумачыцца зноў-такі ў эратычным кантэксце: "Саджанне каравая ў печ імітуе вытворчы акт, у якім прымаюць удзел не толькі людзі, але і навакольныя прадметы" [5, с. 80-81]. Печ як адзін з сакральных локусаў жытла валодае высокім семіятычным статусам . І разам з тым печ уяўляецца каналам сувязі з іншасветам, праз які можна атрымаць пэўныя даброты, інфармацыю аб будучым, які выкарыстоўваецца ў традыцыйнай медыцыне і магічных практыках (т.зв. "перапяканне" дзяцей або звязаныя з печчу варожбы). Уласцівая печы "дзетародная" сімволіка, якая падкрэсліваецца ў традыцыйнай культуры праз паралелізм жаночага ўлоння і ўнутранай прасторы печы, зноў-такі маркіруе сувязь з іншасветам. Саджанне ў печ каравая мае значэнне не толькі ператварэння сырога ў варанае ("прыроднага" ў "культурнае"), але і фармавання яго як увасаблення "долі", надзялення яго неабходнымі ўласцівасцямі і характарыстыкамі.

Як вынікае з апісанняў рытуалу, непасрэдна пасля саджання каравая ў печ прадметам пільнай увагі становіцца начынне, якое выкарыстоўвалася ў працэсе яго вырабу, і найперш – хлебная лапата. Трохразовае стуканне лапатай у столь звязваецца з апеляцыяй да душ продкаў, месца жыхарства якіх, паводле народных уяўленняў, размяшчаецца пад страхою, на гарышчы (часам там жа народная свядомасць лакалізуе і Дамавіка). Адметна, што ў агульным кантэксце эратычна-прадуцыруючай сімволікі маніпуляцыі з лапатай акцэнтуюць увагу на матывах шлюбу: "тады гэтай жа лапатай у столь, у столь тры разы стукнуць, каб яшчэ праз тры гады другая дзеўка пайшла замуж, калі ў хазяіна многа дзевак" [10, с. 552-553]; "першая шаферка выскаквае з гэтай лапатай на вуліцу. Калі сустрэне мужчыну, то павінна хутка выйсці замуж, калі ж жанчыну – у гэтым годзе нельга спадзявацца на шлюб" [10, с. 533].

Шлюбна-эратычную скіраванасць маюць і абрадавыя дзеянні з дзяжою, што выконваюцца пасля саджання каравая ў печ: «маладзіцы ставяць у дзяжу тры запаленыя свечкі, а пасярэдзіне ўтыкаюць нож, і, накрыўшы векам, усе маладухі і дружок падымаюць дзяжу на руках і спяваюць наступную песню: *"Дзяжу носяць на руках, на руках. // А ў той дзяжы тры нажы, тры нажы, // Чацвертый нож на дзяжэ, на дзяжэ, // Да цалуйцеся, да мілуйцеся, маладыя!"*» [10, с. 408].

Падчас выпякання каравая, як правіла, адбываецца частаванне каравайніц, а таксама працягваюцца скокі і спевы, якія павінны паспрыяць росту каравая ў печы. Для гэтага этапу характэрны песенна-заклінальны матыў кшталту *"Расці,*

Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імені А. А. Кулешова

*расці, каравай, // Вышы печы мідзяной, // Вышы столі залатой"* [15, с. 474], хаця ён часта прысутнічае і на этапе замешвання цеста.

У апісаннях слаба адлюстраваны рытуал вymання каравая з печы. Большасць аўтараў абмяжоўваюцца толькі ўказаннямі на гэтае дзеянне. На гэтым фоне асабліва цікавай падаецца рытуальная "гульня ў кавалёў", зафіксаваная ў в. Моталь Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл., калі спецыяльнай песняй спачатку запрашаюцца кавалі, а затым "адна з каравайніц надзяе кажух, вывернуты мехам наверх, бярэ сякеру і пачынае сімвалічна сячы печ" [14, с. 117], пасля чаго вымаюць гатовы каравай. Надзяванне кажуха, яго вывернутасць, прысутнасць вобраза каваля зноў-такі маркіруюць кантакт з іншасветам. Нездарма ў ходзе рытуалу каравай неаднаразова называецца "Божым дарам". Адна з песень, што адпавядае моманту вымання каравая, указвае на асаблівае значэнне гэтай дзеі: *"Дай жэ, Божэ, добры час, // Як у людзей, так і ў нас, // Шчаслівую гадзіну // На нашую радзіму. // Ой, шчоб нашой родзімі, // Шчоб ёй жыто родзіло, // Шчоб ёй жыто родзіло, // Шчоб ёй жыто, пшэніца, // Уселякая пашаніца"* [7, с. 122]. Іншы фальклорны ўзор "праграмуе" добрае жыццё непасрэдна для маладых: *"Печка трасецца, трасецца, / Каравай з печкі просіцца: // Вынімайце мяне з печы, // Палажыце мяне ў жыці, // Штоб маладым харашо было жыці"* [10, с. 227].

Далейшыя рытуальныя дзеянні звязаны з перамяшчэннямі каравая ва ўнутранай прасторы хаты, яго аздабленнем і вынасам у клець. Вынуты з печы каравай размяшчаюць, як правіла, на стале "пад абразамі", на веку ад дзяжы, засланым палатном, ручніком ці абрусам і пасыпаным зернем. Такім чынам, актуалізуецца супрацьлеглы печы локус – чырвоны кут, сакральнасць якога яшчэ больш падкрэсліваецца адпаведнай атрыбутыкай. У чырвоным куце адбываецца наступная дзея каравайнага рытуалу – аздабленне каравая. Шматлікія лакальныя традыцыі ўтрымлівалі свае спосабы яго аздаблення. У некаторых мясцінах аздабленне з цеста – "шышкі" – фармавалі яшчэ на стадыі падрыхтоўкі каравая, вылеплівалі непасрэдна на ім або прымацоўвалі да яго і выпякалі [10, с. 285, 371]. Такога кшталту аздабленне часта мела выразную эратычную афарбоўку, валодала сімволікай плоднасці, дзетараджэння [8, с. 169, 360].

У іншых мясцовасцях упрыгажэнні выпякаліся асобна, а затым імі аздаблялі каравай. Так, у апісанні з Ваўкавыскага павета – гэта "гускі" (загадзя выпечаныя фігуркі рознай формы) і "рагаценька" – "трохзубыя вілкі з грушавага дрэва, якія перад гэтым абвіваюць чырвонаю ніткаю і аблепліваюць цестам. Уваткнуўшы рагаценьку ў каравай, убіраюць яе аўсом, калінаю і рутаю і абвіваюць чырвонаю стужкаю" [7, с. 40]. Такі спосаб аздаблення каравая (жаніховага, як адзначана ў апісанні) зафіксаваны на Брэстчыне [10, с. 584-585]. Каравай нявесты, як вынікае з гэтага ж апісання, упрыгожваецца фігуркамі з цеста, прычым "пасярэдзіне ў караваі зробяць шышку круглую – сонца і промні ад яго, а побач месяц-маладзік" [10, с. 585].

Разнастайнасць спосабаў аздаблення каравая выклікала шматлікія спробы вытлумачэння яго сімволікі. "Саромны" характар фігурак на каравай падкрэслівае яго сувязь з эратычна-прадуцыруючай сімволікай [2, с. 152-153], выявы свяцілаў і трохчасткавая структура каравая суадносяцца з касмаганічнымі ідэямі, з міфалагемай сусветнага дрэва [4, с. 65].

Завяршальны этап рытуалу – выкуп каравая гаспадаром і вынас яго ў клець (камору). Паслядоўнасць гэтых дзеянняў у розных апісаннях вар'іруецца: выкуп адбываецца ў хаце, пасля чаго каравай выносяць, або каравай спачатку выносяць у клець, дзе і адбываецца выкуп. Выкуп фактычна ўказвае на рэалізацыю прынцыпу дараабмену паміж гаспадаром і каравайніцамі, якія, як было ўказана вышэй, выступаюць, па меншай меры, як пасрэднікі паміж "гэтым" светам і

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

іншасветам, адкуль і прыходзяць усе даброты, увасобленыя ў каравае. Уяўляе таксама цікавасць і месца размяшчэння гатовага каравая – клець, "сховішча ўсяго багацця беларускага селяніна" [3, с. 183]. Як правіла, у клеці адбываецца першая шлюбная ноч, і у сувязі з гэтым таксама надзвычай актуальнай становіцца эратычна-прадуцыруючая сімволіка. Звяртае на сябе ўвагу ўжо згаданае апісанне каравайнага абраду, дзе каравай выпякаецца менавіта тады, калі маладыя знаходзяцца ў каморы [8, с. 214-215]. Тут жа і песня з матывамі ўварвання "молайца" ў сад, дратавання руты і страты дзяўчынай сваёй касы [8, с. 215].

## Заключэнне

Каравайны рытуал – адзін з галоўных элементаў традыцыйнага беларускага вяселля, а сам каравай – не проста рытуальная страва, а полісемантычны атрыбут, які найперш увасабляе ідэю Долі (калектыўнай і асабістай), пераразмеркаванне якой адбываецца ў кантэксце вясельнага абрадавага комплексу з улікам новаўтворанай сям'і. Дадзеная аклічнасць вымагае дасканалай арганізацыі працэсу падрыхтоўкі і выпякання каравая. У лакальных традыцыях назіраецца прыкметная разнастайнасць часавага прымеркавання пачатку рытуалу, аднак практычна адсутнічае інфармацыя, чаму менавіта той ці іншы канкрэтны момант быў абраны ў якасці пачатковага. Час выканання каравайнага рытуалу, як і час любога рытуалу ўвогуле, набывае знакавы характар, прадугледжвае магчымасць уплыву на далейшае жыццё не толькі маладых, але і іншых прадстаўнікоў калектыву. Гэтым абумоўліваецца насычанасць рытуалу разнастайнымі магічнымі прыёмамі, якія маюць на мэце "праграмаванне" неабходных характарыстык будучыні для новаўтворанай сям'і (шчаслівага, заможнага жыцця, нараджэння патомства), а таксама забеспячэнне спрыяльных умоў далейшага існавання ўсяго калектыву.

Рытуальная прастора, якая фактычна супадае з унутранай прасторай хаты, а таксама асобныя яе элементы набываюць высокі семіятычны статус. Выкананне асноўных рытуальных дзеянняў звязана найперш з сакральнай воссю "печ" – "чырвоны кут", прычым на розных этапах рытуалу актуалізуюцца не толькі яе полюсы, але і кропкі ўздоўж гэтай восі. У ходзе рытуалу аказваюцца задзейнічанымі і локусы па-за межамі ўласна хаты (найперш клець ці камора, куды выносіцца гатовы каравай), прадуцыруючая сімволіка якіх адпавядае агульнай мэтавай скіраванасці ўсіх рытуальных дзеянняў.

У кантэксце рытуалу фактычна знікае мяжа паміж сферамі "свайго" і "чужога", дзякуючы чаму становіцца магчымым, па-першае, дараабмен паміж гэтымі сферамі, а па-другое, пранікненне ў свет людзей прадстаўнікоў іншасвету, якія могуць паспрыяць ці, наадварот, перашкодзіць належнаму выкананню рытуалу. Адсюль – уяўленні аб прысутнасці падчас выпякання каравая боствау, духаў, міфалагічных істот, а таксама аб неабходнасці выканання living рознага роду апатрапейных дзеянняў.


### *ЛІТАРАТУРА*

1. ***Сумцов, Н.Ф.*** Хлеб в обрядах и песнях / Н.Ф. Сумцов // Символика славянских обрядов. Избранные труды / Н.Ф. Сумцов. – М.: Восточная литература, 1996. – С. 158-248.
2. ***Довнар-Запольский, М.В.*** Ритуальное значение каравайного обряда у белорусов / М.В. Довнар-Запольский. Исследования и статьи. Т. 1: Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность / М.В. Довнар-Запольский. – Киев: Типография 1-й Киевской артели печатного дела, 1909. – С. 147-158.
3. ***Никольский, Н.М.*** Происхождение и история белорусской свадебной обрядности / Н.М. Никольский. – Мн., 1956. – 273 с.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

4. ***Иванов, Вяч.Вс.*** К семиотической интерпретации каравая и каравайных обрядов у белорусов / Вяч.Вс. Иванов, В.Н. Топоров // Труды по знаковым системам / Тартусский государственный университет. – Тарту, 1968. Вып. 3. – С. 64-70.
5. ***Байбурин, А.К.*** Ритуал в традиционной культуре: Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А.К. Байбурин. – СПб.: Наука, 1993 – 240 с.
6. ***Валодзіна, Т.В*** Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т.В. Валодзіна. – Мн.: Тэхналогія, 1999. – 167 с.
7. ***Федароўскі, М*** Люд беларускі: Вяселле / М. Федароўскі. – Мн.: Полымя, 1991. – 142 с.
8. ***Шейн, П.В***. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб., 1887 – 1902. – Т. 1. – Ч. 2: Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – 1890. – 708 с.
9. Вяселле: Песні: у 6 кн. / рэд. М.Я. Грынблат, А.С. Фядосік. – Мн., 1980 – 1986. – Кн. 2 / Склад. Л.А. Малаш; муз. дадат. З.Я. Мажэйка. – 1981. – 831 с.
10. Вяселле: Абрад. – (Беларуская народная творчасць). – 2-е выд. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 683 с.
11. Материалы по этнографии Гродненской губернии. – Вып. 1-2. 1911 – 1912 / Вып. 1; ред. Е.Р. Романов. – Вильна, 1911. – 238 с.
12. ***Иванов, Вяч.Вс.*** К символике каравая в связи с происхождением каравайного обряда / Вяч.Вс. Иванов, В.Н. Топоров // Исследования в области славянских древностей. Лексические и фразеологические вопросы реконструкции текстов / Вяч.Вс. Иванов, В.Н. Топоров. – М.: Наука, 1974. – Гл. 9. – С. 243-258.
13. ***Никифоровский, М.Я.*** Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. Собраны в Витебской губернии / М.Я. Никифоровский. – Витебск, 1897. – 336 с.
14. ***Гуслева, А.Д.*** Каравайны абрад / А.Д. Гуслева, Л.Ф. Шамсутдзінава // Беларускія народныя абрады: навукова-папулярнае выданне; склад. Л.Ф. Касцюкавец. – М.: Беларусь, 1994. – С. 105-127.
15. ***Романов, Е.Р.*** Белорусский сборник. Вып. 1-9 / Е.Р. Романов, 1886 – 1912. – Вып. 8.: Быт белору са. – Вильна, 1912. – 600 с.

Паступіў у рэдакцыю 30.06.2008 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова